УДК 94+98 (476)
ББК 63.3(4 Беи)
Г31

*Рэкамендавана вучэбна-метадычным аб'яднаннем па педагагічнай адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі, якія навучаюцца па спецыяльнасцях 1-02 01 01 Гісторыя; 1-02 01 02 Гісторыя. Дадатковая спецыяльнасць*

Аўтары:
І. І. Багдановіч, М. Ф. Бандзелікаў, Д. У. Дубінін, Г. А. Калечыц,
А.У. Калядзінскі, А.У. Капойка, А.А. Корзюк

Пад рэдакцыяй кандыдата педагагічных навук,
дацэнта *А. А. Корзюка*

Рэцэнзенты:

*С.В. Паноў* — кандыдат педагагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы

*А.І. Філімонаў* — кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык лабараторыі сацыякультурнай адукацыі навукова-метадычнай установы «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Г31 Гістарычнае краязнаўства Беларусі: вучэбна-метадычны дапаможнік / І.І. Багдановіч [і інш.]; пад рэд. А. А. Корзюка. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2014. – 220 с.
ISBN 978-985-99335-8-5

У дапаможніку разглядаюцца пытанні комплекснага навуковага вывучэння гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі, метадаў яе зберажэння і выкарыстання. Важнае значэнне надаецца фарміраванню ў будучых настаўнікаў гісторыі беражлівых адносін да гісторыка-культурных каштоўнасцей і практычных уменняў выкарыстання тэарэтычных ведаў у галіне краязнаўства ў вучэбнай і пазакласнай рабоце.
Адрасуецца студэнтам гістарычных факультэтаў дзённай і завочнай форм атрымання адукацыі, настаўнікам гісторыі агульнаадукацыйных устаноў, усім, хто цікавіцца гістарычным краязнаўствам.

ISBN 978-985-99335-8-5

УДК 94+98 (476)
ББК 63.3(4 БЕИ)

© Афармленне
ТАА ЮрСаПрынт, 2014

Репозиторий БГПУ

# ГІСТАРЫЧНАЕ КРАЯЗНАЎСТВА БЕЛАРУСІ

*Вучэбна-метадычны дапаможнік*

Гродна
«ЮрСаПринт»
2014



Нясвіж пачатку XVII ст. на гравюры Т. Макоўскага



Палац Тышкевічаў у Лагойску на малюнку Н. Орды (другая палова XIX ст.)



Холмская брама Брэсцкай крэпасці. Знешні фасад (пабудавана ў пачатку XX ст., пашкоджана ў 1941 г.). Сучасны выгляд



# ГЛАВА 2

## Развіццё гістарычнага краязнаўства на беларускіх землях

1. *Старажытныя крыніцы гістарычнага краязнаўства Беларусі.*
2. *Гістарычнае краязнаўства ў XIX — пачатку XX стагоддзя.*
3. *Развіццё гістарычнага краязнаўства ў савецкі час.*
4. *Гістарычнае краязнаўства ў другой палове 80-х гг. XX — пачатку XXI ст.*

**1.** Гістарычнае краязнаўства мае старажытныя карані. Першыя звесткі аб падзеях, што адбыліся на тэрыторыі Беларусі, сустракаюцца ў такіх *пісьмовых крыніцах Кіеўскай Русі*, як «Аповесть мінулых гадоў», Лаўрэнцьеўскі і Іпацьеўскі летапісы, «Павучэнне» Уладзіміра Манамаха і інш.

Найбольшую каштоўнасць у вывучэнні нашага краю прадстаўляюць *беларуска-літоўскія летапісы*: «Летапісец вялікіх князёў літоўскіх», Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г, «Хроніка Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага», «Хроніка Быхаўца», «Баркулабаўскі летапіс», «Хроніка горада Магілёва». Шмат цікавых матэрыялаў аб вывучэнні роднага краю ўтрымлівае «Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсяе Русі» М. Стрыйкоўскага.

Да важнейшых крыніц гістарычнага краязнаўства Беларусі часоў Вялікага Княства Літоўскага належаць такія *заканадаўчыя матэрыялы*, як Судзебнік Казіміра 1468 г., Статуты ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг. Яны даюць уяўленне аб грамадска-палітычных і эканамічных адносінах, аб маралі, быце, культуры і мове людзей таго часу. З актавых матэрыялаў першаснае значэнне для краязнаўцаў мае архіў Вялікага Княства Літоўскага («Літоўская метрыка» і Актавыя кнігі княства (1516–1831 гг.), дакументальныя матэрыялы Камісіі Літоўскай казны (1607–1799 гг.), Галоўнага Літоўскага трыбунала (1615–1811 гг.) і Галоўнага Літоўскага суда (1791–1831 гг.). У іх утрымліваюцца звесткі аб палітычным, сацыяльна-



Репозиторий БГПУ